# "Важна з першых вуснаў пачуць адказ"

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3 — 13.)



## Пытанні з інтэрнэт-форуму

***Міхась Матусевіч, студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:***

**— Павел Паўлавіч, памятаю, Вы казалі пра магчымае ўвядзенне праектнай формы працы ў сферы культуры. Хто будзе падаваць праектныя заяўкі? Якія праекты будуць прыярытэтнымі?**

***Павел Латушка:***

— Каментарый па гэтым пытанні дасць начальнік упраўлення мастацтваў.

***Міхаіл Казловіч:***

— Вядзецца праца над Палажэннем аб парадку разгляду праектаў, заяўкамі на іх стварэнне ў сферы культуры. Мы спадзяёмся зацвердзіць дакумент да канца бягучага года, каб у 2011-м разглядаць заяўкі на стварэнне праектаў і аказваць ім падтрымку. Сродкі пад гэтыя мэты на наступны год мы ўжо запланавалі.

***Міхась Матусевіч:***

**— Сфера маіх інтарэсаў палягае ў галіне праектнага менеджменту. Ці магчыма ўладкавацца мне на працу ў Інстытут культуры Беларусі?**

***Павел Латушка:***

— Паважаны Міхась, пра гэта мы запытаем у начальніка аддзела навучальных устаноў і па рабоце з творчай моладдзю.

***Наталля Шмакава:***

— Цяпер аб'яўлены конкурс на пасаду рэктара будучага Інстытута культуры Беларусі, разгледжаны чатыры кандыдатуры з ліку тых, што падалі заяўкі. У хуткім часе пасля прызначэння рэктар на кантрактнай аснове пачне ажыццяўляць набор кадраў, якіх будзе не ставаць у ВНУ. Таму ўладкавацца на працу ў Інбелкульт можна гак сама, як і ў любую іншую вышэйшую навучальную ўстанову рэспублікі: падаўшы заяўку на імя рэктара і пры наяўнасці свабоднага месца.

***Міхась Матусевіч:***

**— За пяць гадоў навучання ва Універсітэце культуры і мастацтваў па сваёй спецыялізацыі я зразумеў, што будучым менеджарам у сферы культуры ў часе навучання не хапае сустрэч з прадстаўнікамі Міністэрства культуры — скажам, у форме адкрытых лекцый. Было б добра заснаваць традыцыю публічных лекцый міністра культуры (якія ўключалі б таксама і адказы на пытанні) недзе на пачатку навучальнага года...**

***Наталля Шмакава:***

— Насамрэч, прадстаўнікі Міністэрства культуры краіны неаднойчы сустракаліся са студэнтамі розных ВНУ, у тым ліку і Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў. Сёлета міністр культуры Павел Латушка атрымаў запрашэнне [illegible]

РЕПОЗИТОРИЙ БГ